## Парадак падачы і разгляду электронных зваротаў

Электронныя звароты могуць быць пададзены ў Браслаўскі райвыканкам з дапамогай дзяржаўнай адзінай (інтэграванай) рэспубліканскай інфармацыйнай сістэмы ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб (далей – сістэма ўліку і апрацоўкі зваротаў) і падлягаюць разгляду ў парадку, устаноўленым для разгляду пісьмовых зваротаў, з улікам асаблівасцяў, прадугледжаных артыкулам 25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Доступ карыстальнікаў да сістэмы ўліку і апрацоўкі зваротаў забяспечваецца з дапамогай сайта ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт па адрасе: https://обращения.бел. Прадастаўленне заяўнікам доступу да сістэмы ажыццяўляецца бясплатна.

Парадак ідэнтыфікацыі (аўтарызацыі) заяўнікаў у сістэме ўліку і апрацоўкі зваротаў, іншыя пытанні, звязаныя з функцыянаваннем сістэмы, устанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Электронныя звароты падаюцца ў адпаведнасці з кампетэнцыяй Браслаўскага райвыканкама. Пералік дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, адказных за разгляд зваротаў па сутнасці ў асобных сферах жыццядзейнасці насельніцтва, зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 г. № 498.

Грамадзяне рэалізуюць права на зварот асабіста альбо праз сваіх прадстаўнікоў. Асабісты ўдзел грамадзян пры падачы і разглядзе зваротаў не пазбаўляе іх права мець прадстаўнікоў, роўна як і ўдзел прадстаўнікоў не пазбаўляе грамадзян права на асабісты ўдзел пры падачы і разглядзе зваротаў. Электронныя звароты ад імя недзеяздольных грамадзян падаюцца іх законнымі прадстаўнікамі. Юрыдычныя асобы рэалізуюць права на зварот праз свае органы або сваіх прадстаўнікоў.

Прадстаўнікі заяўнікаў ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на падставе актаў заканадаўства, альбо актаў упаўнаважаных на тое дзяржаўных органаў, альбо даверанасці, афармленай у парадку, устаноўленым грамадзянскім заканадаўствам. Да электронных зваротаў, пададзеных прадстаўнікамі заяўнікаў, павінны прыкладацца электронныя копіі дакументаў, якія пацвярджаюць іх паўнамоцтвы.

Электронныя звароты выкладаюцца на беларускай або рускай мове.

Электронныя звароты грамадзян павінны змяшчаць:

найменне і (або) адрас арганізацыі альбо пасада і (або) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) альбо ініцыялы асобы, якім накіроўваецца зварот;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) альбо ініцыялы грамадзяніна, адрас яго месца жыхарства (месца знаходжання);

выклад сутнасці звароту.

Электронныя звароты юрыдычных асоб павінны ўтрымліваць:

найменне і (або) адрас арганізацыі альбо пасада і (або) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) альбо ініцыялы асобы, якім накіроўваецца зварот;

поўнае найменне юрыдычнай асобы і яго месца знаходжання;

выклад сутнасці звароту;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) альбо ініцыялы кіраўніка або асобы, упаўнаважанай ва ўстаноўленым парадку падпісваць звароты.

Сутнасць электроннага звароту не можа выкладацца з дапамогай спасылак на інтэрнэт-рэсурсы. Тэкст звароту павінен паддавацца прачытанню. Не дапускаецца ўжыванне ў зваротах нецэнзурных альбо абразлівых слоў ці выразаў.

Пры незахаванні патрабаванняў, устаноўленых часткамі першай-трэцяй пункта 2 артыкула 25 Закона, электронны зварот можа быць пакінуты без разгляду па сутнасці.

Заяўнік мае права адклікаць свой электронны зварот да разгляду яго па сутнасці шляхам падачы пісьмовай або электроннай заявы.

Электронныя звароты разглядаюцца ў тэрміны, устаноўленыя законам Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Адказы (апавяшчэнні) на электронныя звароты накіроўваюцца з дапамогай сістэмы ўліку і апрацоўкі зваротаў, за выключэннем выпадку, калі заяўнік у сваім электронным звароце просіць накіраваць пісьмовы адказ.

У выпадку, калі электронныя звароты аналагічнага зместу ад розных заяўнікаў носяць масавы характар (больш за дзесяць зваротаў), адказы на такія звароты па рашэнні кіраўніцтва райвыканкама могуць размяшчацца на афіцыйным сайце Браслаўскага райвыканкама ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт без накіравання адказаў (апавяшчэнняў) заяўнікам.

Адказ Браслаўскага райвыканкама на зварот або рашэнне аб пакіданні звароту без разгляду па сутнасці могуць быць абскарджаны ў вышэйстаячую арганізацыю – Віцебскі абласны выканаўчы камітэт.